ной архитектуры, признание его высокого художественного уровня открыли в ней утерянный ныне гуманистический масштаб, богатство материалов и форм, изящество деталировки.

## ЛИТЕРАТУРА

1. Агранович, Г. Промышленная архитектура: традиции, преемственность, современные проблемы / Г. Агранович // Архитектура. Строительство. Дизайн. – 2001. № 1. – С. 5–13.

2. Алещенко, Н. В. Особенности архитектурного проектирования промышленных предприятий с учетом природоохранных требований / Н. В. Алещенко. – М. : Ротапринт МАРХИ, 1985. – 88 с.

3. Костов, К. Типология промышленных зданий / К. Костов. – М. : Стройиздат, 1987. – 208 с.

4. Морозова, Е. Б. Архитектура промышленных объектов: прошлое, будущее, настоящее / Е. Б. Морозова – Минск : Технопринт, 2003. – 313 с.

5. Морозова Е.Б. Экологический подход в проектировании промышленных предприятий. – Мн.: Ротапринт БПИ, 1991. – 46 с.

6. Синицына, Н. Н. Адаптация промышленных образований Екатеринбурга к современным изменениям городской среды: дис. / Н. Н. Синицына. – 215 с.

7. Чайко, Д. М. Современные направления интеграции исторических производственных объектов в городскую среду: дис. / Д. М. Чайко. – 231 с.

# ДОЙЛІДСТВА МІНУЛЫХ СТАГОДДЗЯЎ: МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ВЫРАБУ ДЗВЯРЭЙ

**Ю. Т. Шэстак**

*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*E-mail: Erde.by@gmail.com*

*Дадзеная праца прысвечана асноўным матэрыялам, якія выкарыстоўваліся ў мінулым для вырабу фасадных дзвярных запаўненняў. Пры гэтым асобная ўвага надаецца беларускаму досведу. Таксама разглядаецца сувязь паміж матэрыялам выканання і спосабам падвешвання дзвярных створак.*

*Ключавыя словы: дзверы, праём, запаўненне, фасад, матэрыял, драўніна, камень, метал, шкло.*

Мастацкія характарыстыкі абраных для дзвярных запаўненняў матэрыялаў з іх своеасаблівымі пластычнасцю, светапаглынаннем, патэнцыялам да дэталізацыі і стварэння рэльефаў, па-рознаму апрацаванай фактурай натуральным чынам уплываюць на архітэктурна-мастацкую выразнасць збудаванняў. Формаўтваральныя якасці матэрыяла адбіваюцца ў тым ліку на абрысах і прапорцыях праёмаў, характары пластыкі, лекальных дэталяў [1, с. 13]. У мінулым на выбар матэрыяла для архітэктурных элементаў у вялікай ступені ўздзейнічалі яго даступнасць і фізічныя ўласцівасці, галоўным чынам гэта трываласць, вага і даўгавечнасць. Выкарыстанне мясцовай сыравіны не ў апошняй ступені фармавала традыцыйны воблік будынкаў, своеасаблівы для розных краін з рознымі прыроднымі умовамі.

**Скура, тэкстыль**

Першыя дзвярныя праёмы заставаліся пустымі, пазней іх сталі завешваць скурамі жывёлаў, апрацаванымі ў той ці іншай ступені, і тэкстылем. Запаўненні са скуры і тэкстылю шырока выкарыстоўваліся ў Месапатаміі і ва ўсім Старажытным свеце, а пазней засталіся ва ўжытку качавых народаў. Дзвярэй, якія б уяўлялі з сябе скураныя або тэкстыльныя вырабы, на тэрыторыі Беларусі выяўлена не было. Верагодна, яны не захаваліся да нашага часу.

**Камень**

Дзвярныя запаўненні, выраблены з каменю, у асноўным выкарыстоўваліся ў грабніцах і іншых знакавых збудаваннях тых краінаў, дзе было мала лясоў. Да нашага часу не дайшло дагэтуль эксплуатаваных каменных дзвярэй. Адной з прычын магла быць іх занадта вялікая вага. Гэты ж чыннік вызначаў канструкцыю падвешвання: усе такія створкі мелі выступы згары і знізу – пяты. Унутраная дзвер «у замагільны свет» з грабніцы ў Луксоры, якая пасля

вымання са свайго першаснага месца служыла шмат часу фрагментам сцяны ў Карнаку, мае ўзрост 3500 гадоў. Выразана з чырвонага граніта. Па некалькі экземпляраў каменных дзвярэй знайшлі ў Сірыі і на тэрыторыі Этрурыі. Мармуровыя дзверы І ст. да н. э. фрагментарна захаваліся ў Пампеях. У Стамбуле музеефікавана дзвер з грабніцы ў Лангазе (200 г. н. э.), Грэцыя [2]. У Каралеўскім квартале імперыі Віджаянагар у паўднёваіндыйскім горадзе Хампі экспаніруецца двухстворкавая брама, якая датуецца XV ст. Выраблeная з цэльнага валуна, яна ў дэталях імітуе драўляныя дзвяры на буйных пятах. Вялізарныя габарыты вырабу і вага матэрыяла прыводзілі да таго, што адчыніць браму можна было толькі з дапамогай сланоў. Пазнейшых прыкладаў каменных дзвярэй не вядома. На тэрыторыі Беларусі ўвогуле не было знойдзена дзвярэй з каменных матэрыялаў і згадак пра іх. Хутчэй за ўсё, дзвярныя запаўненні ў нас ніколі не рэзалі з каменю, таму што ў паўсядзённым доступе быў іншы трывалы матэрыял: драўніна.

**Драўніна**

З'яўляецца асноўнай сыравінай для вырабу дзвярных запаўненняў. Захаваліся выявы са Старажытнага Егіпта, дзе зафіксаваны драўляныя дзверы розных кшталтаў: са створкамі з адной вельмі шырокай дошкі, а таксама са звязаных паміж сабой тонкіх ствалоў або нават галінаў. На сёнешні дзень самым старажытным з захаваных у фізічным выглядзе дзвярных запаўненняў лічыцца швейцарская неалітычная дзвер з дошак таполі, знойдзеная ў 2010 г. пры археалагічных раскопках у Цурыху (Швейцарыя). Узрост гэтай закансерваванай у спецыяльных умовах створкі складае 5100 гадоў. У Брытанскім музеі захоўваюцца тры фрагмента бронзавага пакрыцця брамы Балават (Іран, ІХ ст. да н. э.), драўляная аснова якіх з часам амаль дашчэнту разбурылася.

І ўсё ж, негледзячы на тое, што драўніна – арганічны матэрыял, які падвяргаецца рознага роду дэструкцыям, існуе шэраг прыкладаў таго, што выраблeныя з яе дзверы могуць служыць па прызначэнні вельмі доўгі час. Самыя старыя драўляныя запаўненні, якія эксплуатуюцца да нашых дзён, – гэта познеантычныя ўваходныя дзверы храма Санта-Сабіны (Рым, 430 г. н. э.). Багата ўпрыгожаныя разьбой, яны зроблены з драўніны кіпарыса. Іншыя, таксама познеантычныя драўляныя дзверы базілікі Св. Амбросія ў Мілане маюць аснову IV ст. н. э. і ўкрапванні больш позніх перыядаў. Для забеспячэння лепшай захаванасці гэтых вонкавых дзвярэй іх паверхня сёння абаронена ліставым шклом.

Драўляная саксонская ўваходная дзвер на завесах у царкве Св. Ботальфа ў Шафран-Уолдэн лічыцца самай старой дагэтуль функцыянуючай дзверру Вялікабрытаніі і датуецца прыкладна 1020 годам. Іншая англасаксонская дзвер 1050 г. зроблена з дуба, ссечанага паміж 1032 і 1064 гг. Яна знаходзіцца ў Вестмінстэрскім абацтве, дзе дагэтуль выкарыстоўваецца па прызначэнні паміж манастырскай часткай і вестыбюлем галоўнага будынка. Трэцяя па старшынстве з выкарыстоўваных дагэтуль дзвярэй у Брытаніі належыць царкве ў Хэдстоку. Датавана пачаткам XII ст. Зроблена з дрэва, ссечанага паміж 1040 і 1070 гг. У Нацыянальным музеі Ісландыі дэманструецца сярэднявечная разная царкоўная дзвер, выраблeная з сасны і датаваная 1190–1200 гг. н. э. Старэйшая еўрапейская замкавая брама, якая закрывала з 1190 г. праём уваходнага корпуса, зроблена з зялёнага дуба, ссечанага паміж 1159 і 1189 гг. Экспануецца ў брытанскім замку Чэпстоў. Колькасць захаваных дзвярэй павялічваецца ў наступныя стагоддзі. Напрыклад, сярэднявечная, дагэтуль эксплуатуемая паўночная дзвер царквы Св. Эдвардса ў Стоў-он-уолд у Глостэршыры ў Брытаніі налічвае 700 гадоў і з'яўляецца ўжо не адзінкавым прыкладам свайго часу.

На тэрыторыі Беларусі абсалютная большасць дзвярных запаўненняў было драўлянымі па прычыне даступнасці і прастаты апрацоўкі гэтага трывалага матэрыяла. Часцей за ўсё драўляная аснова абсталёўвалася скабянымі прыборамі, зробленымі з метала. Такая ж сітуацыя складалася на ўсёй тэрыторыі Еўропы. У Беларусі, Польшчы, Расіі і Украіне нават з'явіўся тэрмін «сталярка» [3]. Ён гістарычна выкарыстоўваўся і да сёння захаваўся ў рэстаўрацыйнай практыцы для абазначэння любых дзвярных і ваконных запаўненняў, экстрапалюючыся нават на металічныя, як на вырабы з драўніны, якія звычайна выконвае столяр.

Самымі раннімі захаванымі дзвярнымі запаўненнямі на тэррыторыі Беларусі можна лічыць знойдзеныя пры раскопках дзверы старажытнага Бярэсця, Віцебску і фрагменты з Мінску. Усе яны датуюцца XII–XIII стст. Канструктыўныя элементы гэтых запаўненняў цалкам драўляныя, дэкор адсутнічаў, мелiся жалезныя ручкі-антабы [4, с. 32]. Гэтыя дзверы мацаваліся на пятках і бегунах. Такі тып падвешвання драўляных створак у нас быў

пашыраны вельмі доўгі час і ў гарадскім жытле і ў сядзібным. Як мацаванні сялянскіх гаспадарчых пабудоваў бегуны выкарыстоўваліся яшчэ ў пачатку XX ст. Фіксаваліся ў брамах замкаў у Міры, Лідзе, Гальшанах, віленскай Вострай браме. [5, с. 18]. У XV ст. паступова распаўсюджваецца тып мацавання драўляных створак на завесах. Першы выпадак фіксуецца ў нас у пач. XV ст. ў Лідскім замку [4, с. 32].

У мінскім музеі старажытнабеларускай культуры знаходзяцца познегатычныя дзверы XV ст. з касцёла ў в. Ішкалдзь Баранавіцкага р-на. Вельмі прыгожыя рэнесансныя дзверы 1620 г. захаваліся ў касцёле Св. Юрыя ў Крамяніцы Зэльвенскага р-на. Першапачаткова яны былі фасаднымі, але пасля прыбудовы прытвора ў XVIII ст. апынуліся ўнутранымі [6, с. 118]. Надзвычай цікавы экзэмпляр драўляных двухстворкавых дзвярэй 1669 г. экспаніруецца ў касцёле ў Ружанах. Выразаны на ім паэтычна-рэлігійны тэкст з'яўляецца самым вялікім з вядомых нам узораў надпісаў на паверхнях дзвярных палотнаў (мал. 1). Колькасць захаваных у Беларусі дзвярных запаўненняў паступова ўзрастае з кожным наступным стагоддзем. І толькі напрыканцы XX ст. гэты матэрыял упершыню ў гісторыі саступае першынства палімерам.




*А – Ранейшыя драўляныя дзверы касцёла.*
*Б. Цэльнаметалічныя дзверы ў крыпце царквы*
***Малюнак 1 – Ружаны***

**Метал**

Для вырабу дзвярных запаўненняў у мінулым выкарыстоўваліся два кшталты металу: бронза (характэрны сплаў медзі з дамешкам цыны) і жалеза (чыстае і чугун). А для вагонных запаўненняў існавалі яшчэ волава і цына. Пераход ад бронзавых дзвярэй да жалезных адбываўся ў тым самым парадку, што пераход ад бронзавага веку да жалезнага, але храналагічна з гэтай падзеяй не карэляваўся. На працягу доўгага часу з **бронзы** выраблялiся дарагія парадныя дзверы знакавых мураваных пабудоваў, а астатнія запаўненні працягвалі выконваць з драўніны. Тэрытарыяльна бронзавыя дзверы былі значна менш распаўсюджаныя на паўночным захадзе Еўропы да пачатку класіцызму.

Самымі старажытнымі бронзавымі дзвярыма ў Еўропе, якія выкарыстоўваюцца да гэтага часу, лічыцца брама ў паўднёва-заходнім прытворы сабора Св. Сафіі. Вырабленая ў II ст. да н. э., яна была перанесена ў Канстанцінопаль напрыканцы X ст. з дахрысціянскага храма ў Тарсусе. Другімі па старшынству эксплуатуемымі дзвярымі з'яўляюцца вялікія бронзавыя дзверы 115 г. н. э. з рымскага Пантэона. Тут выбар матэрыялу быў непазбежны: практычна ўсе знешнія паверхні велічнага будынка былі пакрыты бронзай, пазней дэмантаванай падчас узвядзення базілікі Св. Пятра. Цэнтральны партал латэранскага храма

захаваў бронзавыя дзверы Курыі Юлія (324 г. н. э.). Бронзавыя «Ваўчыныя дзверы», адлітыя для заходняга партала Паланцінскай капліцы ў Аахене, Германія, (цяпер – у Кафедральным саборы) былі адліты каля 800 г. н. э. Іх цяжкая вага (каля 4 т.) відаць была прычынай таго, што асноўны ўваход здаўна здзяйсняецца праз невялікую дзвер справа. Бронзавыя дзверы бакавога партала сабора ў Майнцы, Германія, датуюцца 1009 г. Архібіскуп Вігіліс загадаў зрабіць на іх надпіс з імём імператара Карла Вялікага, з дапамогай чаго спадзяваўся атрымаць дазвол перанесці ў Майнц працэдуру каранацыі. Кожная з дзвюх створак раманскіх дзвярэй Бернворда з сабора Хільдесхайма ў Германіі была адліта з людвісарскай (пушачнай) бронзы да 1015 г. як адзінае цэлае, улучна з такімі дэталямі, як дзвярныя малаткі. Вага кожнага палатна складала 1,85 тоны. Аверс упрыгожаны рэльефнымі выявамі сцэн з Бібліі, якія лічацца не толькі мастацкім шэдэўрам оттанаўскага перыяду, але і прызнаны першым цыклам адлітых у метале рэльефных выяваў у Германіі [7, с. 115]. У пазнейшы перыяд бронзавыя дзверы больше не робяць цэльналітымі за выключэннем хіба што базілікі ў Гнёзна. Там, каля 1175 г.**,** адны з дзвярэй таксама адліваюць з адной формы, але для другіх ужо спайваюць паміж сабой 24 бронзавыя панэлі. У гэты перыяд вядома яшчэ некаторая колькасць захаваных бронзавых дзвярэй. Напрыклад, дзверы 1076 г. царквы Архангела Міхаіла з Монтэ Сант-Анджала, дзверы 1070 г. у рымскай базіліцы Сан-Паала-Ф'ёры-ле-Мура, візантыйскія дзверы 1066 г. кафедральнага сабора ў Амальфі і дзверы 1087 г. у царкве Сан-Сальватора дэ Бірэкта ў Атрані і г. д. [8, с. 221]. Створкі ўсіх гэтых дзвярэй мацаваліся на пятах ці бегунах, а ўжо пазнейшых – на завесах. У цэлым, дзверы з бронзы з часам перастаюць быць рэдкасцю, але далёка не ўсе з іх уяўляюць з сябе мастацкую цікавасць, як напрыклад, тры цалкам бронзавыя, з пазалотай, дзверы Фларэнтыйскага баптыстэрыя Св. Яна (XIV – сяр. XV стст.), дзе з гэтага ж матэрыяла адлітыя нават дзвярныя каробкі. Усходнія дзверы аўтарства Ларэнца Гіберці Мікеланджала назваў Брамай выраю [9, p. 36]. У 1990 г. дзверы баптыстэрыя замененыя копіямі, а арыгіналы музеефікаваныя ў спецыяльных умовах. У XX ст. копіі гэтых вырабаў усталяваны ў некалькіх саборах і грамадскіх будынках у Расіі і Злучаных Штатах. Самыя ж вядомыя манументальныя бронзавыя дзверы ЗША (і падобна, што першыя) з'яўляюцца ў 1863 г. у будынку Капітолія. Пазней там развіваецца сапраўдная мода на нэараманскія дзверы з бронзы. Напрыклад, у 1927 г. у Бостане для чайнага дома Салада праектуюцца двухтонныя бронзавыя дзверы з рэльефамі і атрымлі-ваюць за сваё хараство срэбны медаль Парыжскага салона таго ж года.

Дзвярей з бронзы, цэльнаадлітых або спаяных, на тэрыторыі Беларусі нам не вядома. Па-першае, тут няма ўласных радовішчаў медзі. Нават цягам бронзавага веку ў нас выкарыстоўваліся ў першую чаргу крэмневыя прылады працы [10, с. 34–35]. Па-другое, вельмі верагодна, што яны не захаваліся ў сілу шматлікіх ваенных інтэрвенцый і разрабаванняў, калі бронза як вельмі каштоўны метал у мінулым дэмантавалася дзеля разнастайных патрэбаў. Аднак сустракаліся дзверы з **жалеза.** У параўнанні з бронзавымі яны мацней падвяргаюцца карозіі, затое больш устойлівыя да механічных уздзеянняў. Жалеза даступней за медзь, паклады яго руды ў свеце сустракаюцца значна часцей, асабліва за цыновыя, таксама неабходныя для вытворчасці бронзы.

Жалезныя дзверы распаўсюдзіліся ў перыяд готыкі і пазней, выкарыстоўваючыся і для парадных уваходаў, і увогуле для моцнай абароны тых будынкаў ці памяшканняў, дзе захоўвалася нешта каштоўнае: храмы, крыпты, скарбніцы і інш. Такіх узораў амаль не было на поўдні Еўропы, але яны сустракаліся ў нашым рэгіёне. Напрыклад, катэдра кракаўскага Вавеля (XIV ст.), ратуша ва Уроцлаве (XV ст.), храм Св. Ганны ў Вільні (1500 г.) і інш. Пазней былі спробы рабіць манументальныя запаўненні з чугуна. У 1881 г. у Вормсе (Германія) стварылі дзверы па ўзоры бронзавай брамы Бернвольда. Жалезныя дзверы падвешваліся на завесы, якія выраблялiся з таго ж матэрыялу.

Самымі раннімі вядомымі на прылеглых да Беларусі раёнах дзвярнымі запаўненнямі з жалеза былі дзверы XVI ст. з царквы ў Супраслі (сёння знаходзіцца на тэрыторыі Польшчы на мяжы з Беларуссю) [4, с. 34–35]. Нажаль, не захаваліся да нашага часу дзверы сінагогі Старога Быхава сярэдзіны XVII ст., зафіксаваныя на фотаздымках 1937 г. У вонкавых цэльнаметалічных дзверэй 1762 г. на апсідзе былой уніяцкай царквы Св. Пятра і Паўла ў Ружанах ёсць пара: унутраныя дзверы з рызніцы (мал. 1). На гэтым прыкладзе выразна

бачна, што моцныя жалезныя дзверы ўстаўляліся туды, дзе захоўваліся каштоўнасці. Пазней цэльнаметалічныя дзверы ў нас выцясняюцца драўлянымі, і толькі ў часы гістарызму і мадэрну зноў з'яўляецца некаторая колькасць металічных запаўненняў. Дагэтуль захаваліся жалезныя дзверы могілкавых капліц у Івашкаўцах Смаргонскага р-на (1905 г.) і камплект з трох запаўненняў у Кіякове Докшыцкага р-на (1907 г.).

Да асноўных матэрыялаў, якія выкарыстоўваліся для вырабу дзвярэй, можна дадаць прамежкавыя або змяшаныя кшталты. Гэта спалучэнні драўніны з металам, драўніны і каменю, драўніны і шкла.

**Драўніна і метал**

Звычайна у існых класіфікацыях, напрыклад у Я. Тайхмана, такое спалучэнне матэрыялаў не вылучаецца ў асобны кшталт [11]. Аднак, калі размова ідзе пра тое, якія матэрыялы складаюць структурную частку палатна, нельга не прыняць да ўвагі той факт, што ў некаторых выпадках драўніна і метал выступаюць як раўнапраўныя ў канструкцыі дзвярнога запаўнення. Часта ў такіх выпадках мы пры знешнім аглядзе можам палічыць такія дзверы цэльнаметалічнымі. Спалучэнне матэрыялаў рэалізуецца ў трох варыянтах: наслайванне аднога на другі, ўстаўка металічных панэляў у драўляную рамную аснову, дадаванне жалезнага бегуна, які з'яўляецца часткай створкі.

Самымі старымі захаванымі драўляна-металічнымі запаўненнямі можна лічыць пакрытыя бронзавымі пласцінамі з разьбой дзверы царквы Раства Хрыстова ў Віфлееме (VI ст.). Вядома, што вонкавыя дзверы каірскіх мячэтаў мелі пакрыццё з аркушаў бронзы ці жалеза з разьбой і рэльефамі [2]. Ідэя адліваць усю бронзавую створку з адной формы не прыжылася пасля сабора Хільдесхайма, і наступныя манументальныя дзверы звычайна складаліся з драўлянай рамы з устаўленымі бронзавымі панэлямі. Гэта напрыклад, дзверы Аўгсбургскага сабора (XI ст.), дзверы Сан-Зянона, Вероны (XII ці XIII ст.). Да нашых дзён выкарыстоўваецца пакрытая бронзавым акладам драўляная Корсунская брама – дзверы прыдзела раства Прасвятой Багародзіцы ў саборы Св. Сафіі ў Ноўгарадзе. Пры гэтым драўляная створка замянялася ў XIX ст., дзвярная каробка – каля 1560 г. Самыя старажытныя бронзавыя часткі датуюцца 2-й пал. XI ст., а іншыя XIV і XVI ст. [12]. Заходні ўваход гэтага сабора закрываюць раманскія дзверы сярэдзіны XII ст. – Магдебургскія ці Плоцкія Вароты. Зробленыя з дубу, яны суцэльна пакрытыя літым бронзавым акладам з рэльефнымі выявамі. А ў саборы Плоцка з 1982 г. захоўваецца іх капійны варыянт.

Жалеза, як і бронза, было дарагім матэрыялам, таму напрыклад у Брытаніі не захавалася цэльнаметалічных дзвярэй, толькі драўляна-металічныя, як дзверы рызніцы абацтва Цьюксберы, звонку суцэльна абабітыя рэшткамі жалезных даспехаў, знойдзеных пасля бітвы пры Цьюксберы (1481 г.). Абіўку жалезнымі аркушамі нельга лічыць выключна відам дэкора, так як гэты прыём служыў у першую чаргу для павелічэння трываласці дзвярнога палатна і «непрыступнасці» абсталяваных ім памяшканняў. Так, напрыклад, абедзве дзверы сакрыстый касцёла ў Вялікай Бераставіцы Бераставіцкага р-на (1741 г. паб.) былі набраны з слоя дошак, забяспечанага трыма завесамі, якія, судзячы па капелюшах цвікоў, не даходзілі да края палатна. Звонку дошкі збіраліся трыма кавалкамі ліставога жалеза, а згары гэтага слоя – пасамі метала, размешчанымі па контуру і ў выглядзе літары "Ж" – па цэнтральнай частцы. У інвентары брамы замка ў Крэва 1769 г. апісваюцца галоўныя падвойныя дзверы з дошак на жалезных бегунах, пры гэтым іншыя, ў вартоўню, прымацаваны на завесах.

**Драўніна і камень**

Раннія дзвярныя запаўненні з цвёрдых матэрыялаў уяўлялі з сябе створкі, якія падвешваліся на пятах або бегунах, і свайго роду палавінную раму або каробку, якая складалася з парогу і бэлькі згары, куды ўваходзілі адпаведна ніжні і верхні выпускі пятаў. І калі асноўная частка (дзвярное палатно) была з драўніны (звычайна ў Старажытным свеце гэта былі вяз, кедр, дуб альбо кіпр), то элементы рамы вельмі часта выраблялiся з цвёрдага каменя, такога як базальт альбо граніт. Так, з дрэва алівы і каменю былі зроблены дзверы Першага Ерусалімскага храма (950 г. н. э.) [2, р. 419]. Драўляныя дзверы пабудоваў Ніпура (2000 г. да н. э.), духоўнага цэнтра Шумера, мацаваліся ў парог і верхнюю бэльку з даларыту. Падобна, што такая ж двухстворкавая канструкцыя з кедра і каменю выкарыстоўвалася там і ў XVII ст. да н. э., пра што сведчаць радкі з «Эпаса аб Гільгамешы» [13]. На тэрыторыі Беларусі падобных прыкладаў нам не вядома.

**Драўніна і шкло**

У мінулым фасадныя дзвярныя запаўненні у пераважнай большасці выпадкаў рабіліся глухімі, або маглі мець невялікія продухі для агляду. Аднак пасля з'яўлення ў XVII ст. французскіх вокнаў да падлогі паступова гэта канструкцыя пераходзіць і на вонкавыя дзверы. Асабліва гэтая з'ява была характэрна для грамадскай і сядзібнай архітэктуры. Так былі вырашаны дзверы палаца Бутрымовіча ў Пінску (XVIII ст.), сядзібы ў Поразаве Свіслацкага р-на (XIX ст.) і інш. З XIX ст. распаўсюджваюцца дзверы, дзе часткай запаўнення з'яўляецца зашклёная фрамуга. Такі прыём стаў выкарыстоўвацца і для сакральных будынкаў. Напрыклад, высокія дзверы касцёла ў Параф'янаве (1913 г.) завяршаюцца паўарачнай фрамугай з драўлянымі імпастамі і дэкаратыўным элементам у цэнтры. У Свіры Мядзельскага р-на ў былым рэстаране канца XIX ст. захаваліся адметныя разныя дзверы з фрамугай з выразным малюнкам імпастаў. Такія дзверы падвешваліся на завесы, якія пазней трансфармаваліся з петлі. Узаемазалежнасць спосабу мацавання створкі і матэрыяла, з якога зроблена дзвярное запаўненне паказана ў табліцы 1.

Табліца 1 – Дзвярныя запаўненні па спосабу навешвання створак і матэрыяле (паводле захаваных альбо вядомых прыкладаў)

| Навешванне / Матэрыял | На пятах ці бегунах | | На завесах | | На петлях | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Беларусь | Іншыя краіны | Беларусь | Іншыя краіны | Беларусь | Іншыя краіны |
| **Тэкстыль / скура** | – | – | – | – | – | – |
| **Камень** | – | + | – | – | – | – |
| **Драўніна** | + | + | + | + | + | + |
| **Метал** | – | + | + | + | – | + |
| **Драўніна і метал** | + | + | + | + | – | – |
| **Драўніна і камень** | – | + | – | – | – | – |
| **Драўніна і шкло** | – | – | + | + | + | + |

**Высновы**

Дзвярное запаўненне: каробка і створкі – могуць быць выкананы з розных матэрыялаў. Абраны спосаб мацавання створак: на пятах ці бегунах, завесах, петлях – таксама залежыць ад матэрыялу. На тэрыторыі Беларусі няма звестак пра запаўненні, якія ў мінулым выраблялісяз тэкстылю, скуры, каменю, бронзы, спалучэння драўніны і каменю. Захавалася па некалькі прыкладаў дзвярэй з цэльнага жалеза, а таксама камбінацыі драўніны і жалеза. Такія дзверы выкарыстоўвалі там, дзе была патрэбная асабліва трывалая абарона ад пранікнення. Дзвярныя запаўненні з драўніны і шкла з'яўляюцца пасля XVII ст. у грамадзянскай архітэктуры, а з XIX ст. распаўсюджваюцца ў варыяцыі з зашклёнай фрамугай. Пераважная большасць беларускіх дзвярэй выраблялася з драўніны. Падвешванне створак драўляных дзвярэй здзяйснялася ўсімі спосабамі: спярша – на пятах і бегунах, з XV ст. з'яўляюцца завесы, ў XX ст. распаўсюджанне атрымліваюць петлі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Байер, В. Е. Архитектурное материаловедение: учебник для вузов / В. Е. Байер. – М. : «Архитектура-С», 2012. – 264 с.
2. Spiers, R. P. Door / R. P. Spiers // The Encyclopedia Britannica. A Dictionary of Arts, Sciences, Literature and General Information : in 29 v. / Forgotten Books ; ed. H. E. Hooper. – London, 2017. – Vol. 8. – P. 419–420.
3. Tajchman, J. Stolarka okienna. Słownik terminologiczny arcitektury / J. Tajchman. – Warszawa : Ośrodek Dokumentacji Zabytków, 1993. – 31 s.
4. Трусов, О. А. Двери и их атрибуты на примере памятников белорусского зодчества / О. А. Трусов // Строительство и архитектура Белоруссии. – 1988. – № 3. – С. 32–36.
5. Шэстак, Ю. Т. Тыпалогія дзвярэй у беларускім дойлідстве: канструкцыі і дэкор / Ю. Т. Шэстак // Архитектура и строительные науки. – 2013. – № 3–4. – С. 18–20.
6. Габрусь, Т. В. Саборы помняць усё : готыка і рэнесанс у сакральным дойлідстве Беларусі / Т. В. Габрусь. – Мінск : Беларусь, 2007. – 166 с.
7. Jantzen, H. Ottonische Kunst [Ottonian Art] (in German) / H. Jantzen. – Hamburg : Rowohlt, 1959. – 180 s.

8. Герберштейн, С. Записки о Московии / С. Герберштейн; пер. с нем. А. И. Малеина, А. В. Назаренко. – М. : Изд-во МГУ, 1988. — 430 с.
9. Coughlan, R. The World of Michelangelo: 1475–1564 / R. Coughlan. – New York : Time-Life Books, 1971. – 202 с.
10. Чарняўскі, М. М. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі / М. М. Чарняўскі. – Мінск : Нар. асвета, 1981. – 64 с.
11. Tajchman, J. Drewniane drzwi zabytkowe na terenie polski (Systematyka i problematyka konserwatorska) / J. Tajchman // Ochrona zabytków. – 1991. – № 4. – s. 269–277.
12. Трифонова, А. Н. Бронзовые двери Софийского собора в Новгороде / А. Н. Трифонова // Новгород и Новгородская Земля. История и археология. – 1995. – № 9. – С. 72–75.
13. Эпос о Гильгамеше / Перевод с аккадского И. М. Дьяконова. – М. : Изд-во Академии наук СССР, 1961. – 214 с.

# К ВОПРОСУ ОБ ИСТОРИИ ОСНОВАНИЯ ПРАВОСЛАВНОГО НЕКРОПОЛЯ КОБРИНСКОГО ФОРШТАДТА КРЕПОСТИ БРЕСТ-ЛИТОВСК

**Н. Н. Власюк**

*Брестский государственный университет*
*Брест, Беларусь*

Два чувства дивно близки намъ,
Въ нихъ обрѣтаетъ сердце пищу:
Любовь къ родному пепелищу,
Любовь къ Отеческимъ Гробамъ.

На нихъ основано отъ вѣка
По Воле Бога Самого
Самостоянье человѣка,
И Всё Величіе Его.

Животворящая святыня!
Земля безъ нихъ была бъ мертва,
Какъ безотрадная пустыня
И какъ Алтарь безъ Божества

А. С. Пушкинъ. Черновикъ 1830

Полевой сезон 2018 года, только через 185 лет наконец поставил окончательную точку на дате основания православного некрополя Кобринского форштадта крепости Брест-Литовск. Символично, что во время инвентаризации кладбища, 1 июля 2018, был обнаружен закладной камень кладбища. На камне выбит крест, по обеим сторонам которого располагались буквы «IC” и «XC” (Иисус Христос), а ниже инскрипция: «1833, 1 іюля».

В Речи Посполитой, в которую входил Брест-Литовск до конца XVIII в., автономных городских христианских кладбищ не существовало. Горожан хоронили на прикостельных, прицерковных и монастырских кладбищах. Самостоятельные кладбища были только у приверженцев ислама и иудаизма. В Бресте действовало около десятка католических монастырей, два восточного обряда, более десятка отдельных культовых зданий. Таким образом христианских кладбищ в городе насчитывалось более двадцати.

В XVI веке половина населения Европы умерла от таинственного «английского пота». Очаги эпидемий чумы XVII века в Англии, Польше и Италии унесли сотни тысяч жизней. Только в 1653–1658 от сыпного тифа умерло около 2000 берестейцев. В XVIII веке: 1710 «моровая пошесть» в Брест-Литовске, эпидемии чумы во Франции, Марсель 1720–1722 (100000 жизней), 1770–1772 Россия, Москва (80000 жизней). Эпизодические вспышки чумы почти по всей Европе были вызваны и подзахоронениями родственников в инфекционные могилы. К середине XVIII века в Речи Посполитой, пожалуй, единственной благополучной от чумы стране, городские христианские кладбища были переполнены, не имея возможности расширять некрофации, горожане погребали покойников в могилы родственников. В 1745